## *УСТУПНАЕ СЛОВА*

*Студэнцкая навукова-даследная лабараторыя «Тэорыя і практыка мытнай справы і знешнеэканамічнай дзейнасці» была ўтворана пры кафедры мытнай справы факультэта міжнародных адносін БДУ ў снежні 2011 г. Праз год на сходзе савета па навукова-даследнай працы студэнтаў і магістрантаў БДУ яна была афіцыйна зарэгістравана, а ў снежні 2013 г. адбыліся чарговыя выбары рады лабараторыі. Акрамя выкладчыкаў кафедры мытнай справы – Уладзіміра Ляхоўскага (кіраўнік) і Вольгі Жукоўскай (заступнік кіраўніка) – у склад кіраўніцтва СНДЛ увайшлі студэнты 3–5 курсаў: Ганна Ярашынская (адказны сакратар), Татьяна Акунец, Глеб Андрэеў, Александра Мельнікава, Паліна Міхайлоўская, Канстанцін Нашчынец, Алена Яўзрэзава і Анастасія Шыманская. Пры СНДЛ дзейнічаюць інфармацыйна-аналітычная група (Алена Мажэйка, Карына Сарока, Варвара Кунавіч і Вераніка Шульгоўская) і рэдакцыйна-выдавецкі аддзел (Аляксандра Ісакова, Вольга Макавецкая і Марыя Патапенка). На сёння ў навукова-даследнай рабоце ў рамках лабараторыі ўдзельнічаюць 36 студэнтаў і 2 магістранта.*




Сябры студэнцкай навукова-даследнай лабараторыі «Тэорыя і практыка мытнай справы і знешнеэканамічнай дзейнасці» са сваімі выкладчыкамі падчас працы IV Міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай Мытнаму саюзу. Верасень 2013 г.

*Галоўная мэта студэнцкай навукова-даследнай лабараторыі «Тэорыя і практыка мытнай справы і знешнеэканамічнай дзейнасці» – інтэграцыя навучальнага працэсу з навукова-практычнай дзейнасцю студэнтаў спецыяльнасці «Мытная справа» ФМА БДУ і актывізацыя працы па паляпшэнні якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для мытных органаў, суб'ектаў гаспадарання, звязаных са знешнегандлёвай і транспартна-лагістычнай дзейнасцю. Дзеля дасягнення пастаўленай мэты вызначаны наступныя задачы: прыцягненне да навукова-даследнай працы найбольш здольных студэнтаў; фарміраванне ў іх належнай навуковай і метадалагічнай асновы для паспяховага навучання ў магістратуры і аспірантуры; комплекснае вывучэнне розных аспектаў, звязаных з мытнай дзейнасцю (юрыдычных, эканамічных, гістарычных, лагістычных, навукова-тэхнічных і інш.); актыўнае ўзаемадзеянне з мытнымі органамі і суб'ектамі гаспадарання для набыцця практычнага досведу ў сферы, звязанай з мытнай і знешнеэканамічнай дзейнасцю.*



Сябры рады студэнцкай навукова-даследнай лабараторыі «Тэорыя і практыка мытнай справы і знешнеэканамічнай дзейнасці» (злева направа): Т. Акунец, Г. Ярашынская і А. Мельнікава.

*Дзейнасць лабараторыі будзе спрыяць паглыбленню і замацаванню ў студэнтаў тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў па абранай спецыяльнасці. Удзел у праектах СНДЛ дапаможа ім авалодаюць пачаткамі навукова-арганізацыйнай працы. Пастаўленыя задачы будуць рэалізоўвацца праз арганізацыю студэнцкіх навукова-практычных семінараў і алімпіяд, падрыхтоўку і прэзентацыю лепшых студэнцкіх прац на ўніверсітэцкіх, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах, дзякуючы удзелу членаў лабараторыі ў навуковых канферэнцыях розных узроўняў.*

*Як паказвае аналіз большасці навуковых работ студэнтаў, апошнім для паспяховай рэалізацыі сваіх даследницких праектаў перашкаджае ў першую чаргу слабая метадалагічня падрыхтоўка. Азнаямленне маладых вучоных з сучасным агульнаметадычным і метадалагічным інструментарыем навукова-даследніцкай працы стане прыярытэтам у дзейнасці СНДЛ «Тэорыя і практыка мытнай справы і знешнеэканамічнай дзейнасці».*



Сябры рэдактарска-выдавецкага аддзела СНДЛ (злева направа) А. Ісакава, В. Макавецкая і М. Патапенка, якія маюць непасрэднае дачыненне да падрыхтоўкі дадзенага зборніка.

*Не менш актуальным для маладых даследнікаў застаецца пытанне аб аператыўнай апрабацыі вынікаў сваіх распрацовак у навуковых выданнях. Удзельнікі СНДЛ «Тэорыя і практыка мытнай справы і знешнеэканамічнай дзейнасці» падтрымалі ініцыятыву кіраўніка лабараторыі аб выданні свайго навуковага штогодніка, дзе б рэгулярна публікаваліся лепшыя студэнцкія*

*працы па розных напрамках мытнай навукі. Намаганнямі рэдакцыйна-выдавецкага аддзела лабараторыі гэтая ідэя была ўцелаішчана ў жыццё.*

*Вы трымаеце ў руках першы выпуск студэнцкага навуковага штогодніка «Мытная справа і ЗЭД», у якім прадстаўлены 24 навуковых даклада, прысвечаных прававому і эканамічнаму забеспячэнню мытнай дзейнасці, міжнароднай лагістыцы, укараненню інавацыйных тэхналогій у практыку мытнай справы, а таксама гісторыі мытні. Першы крок зроблены!!! І мы ўпэўнены, што дадзены пачын стане трывалай традыцыяй. Наперадзе ў нас вялікія планы і шмат працы...*

***Уладзімір* Ляхоўскі**, *кандыдат гістарычных навук, дацэнт; кіраўнік СНДЛ*
*«Тэорыя и практыка мытнай справы і знешнеэканамічнай дзейнасці».*